Леановіч З.Л.,
дацэнт
Маеўская В.П.,
дацэнт

# КАМПАЗІТАР М.КУЛІКОВІЧ-ШЧАГЛОЎ

Працэсы дэмакратызацыі ў жыцці нашага грамадства набылі незваротны характар. Сёння ёсць магчымасць больш падрабязна даведацца пра жыццё замежных суайчыннікаў. Лепшыя імёны беларускага замежжа хутка ўвойдуць у нашу нацыянальную культуру.

Адным з таленавітых суайчыннікаў з'яўляецца кампазітар М.Куліковіч-Шчаглоў. Будучы кампазітар (як сведчыць вядомы англійскі даследчык беларускай культуры Гай дэ Пікарда) нарадзіўся ў Маскве ў 1897 годзе. Дзякуючы выдатным музычным здольнасцям, Мікола паступае ў Маскоўскае сінадальнае вучылішча, дырэктарам якога быў А.Кастальскі. Пасля вучылішча – Маскоўская кансерваторыя, клас М.Іпалітава-Іванава.

Скончыўшы кансерваторыю, М.Шчаглоў працуе на Украіне. Там ён стварае песні і рамансы на ўкраінскія тэксты.

З 1927 года знаходзіцца на Смаленшчыне, дзе захапляецца збіраннем беларускага музычнага фальклору.

Творчыя здольнасці М.Шчаглова разгарнуліся з прыездам яго на Беларусь. У 1937 годзе ён становіцца дырыжорам сімфанічнага аркестра радыёкамітэта, з'яўляецца членам Саюза кампазітараў БССР, працуе ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі.

У гэты перыяд ім былі напісаны «Беларуская сюіта», Першая і Другая сімфоніі, Канцэрт для фартэпіяна з аркестрам. Вялікую папулярнасць набывае «Кантата пра Сталіна», якая выконвалася ў Маскве ў час дэкады беларускага мастацтва. Ноты Кантаты, як і Другой сімфоніі, лічацца страчанымі. Пра гэтыя творы можна меркаваць толькі паводле рэцэнзіі ў часопісу «Советская музыка».

Дзякуючы яшчэ адной публікацыі ў часопісу можна скласці ўяўленне аб героях і змесце оперы «Кацярына» на лібрэта М.Клімковіча. Рэцэнзенты адзначаюць цікавую музычную мову Куліковіча-Шчаглова, вялікае кампазітарскае майстэрства, сувязь яго музыкі з цудоўным каларытам беларускай песні.

М.Шчаглоў становіцца прыкметнай асобай у культурным жыцці Беларусі. У 1940 годзе ён быў узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

У час Вялікай Айчыннай вайны Шчаглоў жыў у Мінску і працягваў збіраць музычны фальклор. Частка яго апрацовак увайшла ў «Зборнік купальскіх і жніўных беларускіх песень», выдадзены ў Мінску ў 1943 г. У гэты ж час ён пісаў асветніцкія артыкулы ў газеты.

У ваенныя гады ім створаны дзве оперы на лібрэта Н.Арсеньевай «Лясное возера» і «Усяслаў Чарадзей». Оперы былі высока ацэнены крытыкамі. Музыка М.Шчаглова параўноўваецца з музыкай М.Мусаргскага, А.Барадзіна. Дзейнасць Шчаглова вызначаецца рознабаковасцю. Ён пісаў оперную музыку і кампазіцыі «мадэрных» танцаў для моладзі. Ім складзены «Юнацкі спеўнік», ён жа вядомы як рэфарматар беларускай царкоўнай музыкі. Па прыкладу свайго настаўніка А.Кастальскага, ён выкарыстоўвае ў літургічных кампазіцыях напеўкі з беларускіх народных песень.

У канцы вайны Шчаглоў выязджае пад прозвішчам маці за мяжу. Там М.Куліковіч працягвае працаваць над царкоўнай музыкай. У 1948 г. ён закончыў «Літургію св. Яна Хрызастома» і «Усяночную», у якіх выкарыстоўвае напеўкі беларускіх народных песень.

Акрамя кампазітарскай дзейнасці, Куліковіч займаўся таксама даследчай працай. У 1944 г. у Берліне выйшла кніга М.Куліковіча-Шчаглова «Беларуская музычная культура».

У 1950 г. ён пераязджае ў ЗША, дзе многа працуе ў якасці выкладчыка фартэпіяна, кіруе хорам уніяцкай царквы.

Адначасова працягваецца дзейнасць кампазітара як музычнага крытыка і гісторыка. У 50-х гадах апублікаваны яго гістарычны агляд «Беларуская музыка» і аналітычная праца «Беларуская савецкая опера».

У Амерыцы выйшлі песенныя зборнікі, укладзеныя М.Куліковічам-Шчагловым: «Калядоўшчыкі», «Беларускія песні і танцы для акардэона» і яшчэ адзін песенны зборнік, які змяшчае каля ста твораў, апрацаваных для голасу і фартэпіяна.

Яго творы былі ўключаны і ў «Беларускі царкоўны спеўнік». Але найвыдатнейшыя творы М.Куліковіча-Шчаглова, па сведчанню Г.Пікарда, пакуль што застаюцца не апублікаванымі і не выкананымі.

Пасля смерці кампазітара ў 1969 г. яго архіў быў перасланы ў Беларускую бібліятэку імя Францішка Скарыны ў Лондане.

Сёння пачалося вяртанне творчасці М.Куліковіча-Шчаглова на радзіму. Творчая спадчына кампазітара ў асноўным знаходзіцца ў рукапісах і таму невядома ў музычным свеце, а даваеннага архіва фактычна няма.

У Нацыянальнай бібліятэцы маюцца некалькі зборнікаў М.Куліковіча-Шчаглова: «Беларускія песні і танцы для акардэона»,»Беларускі песенны зборнік», «Калядоўшчыкі». Яго творы можна знайсці ў «Беларускім духоўным спеўніку». Маюцца (па сведчанню музычнага крытыка Св.Берасцень) ксеракопіі «Зборніка купальскіх і жніўных беларускіх песень».

Творчасць аднаго з вядучых кампазітараў перадваеннага перыяду Беларусі мае права ўвайсці ў нацыянальную культуру як наша агульная духоўная спадчына.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ